***Міхеева А. М.****, кіраўнік фізічнага выхавання дзіцячага сада № 25 г. Магілёва*

# Бульбачка-беларусачка

## Фізкультурны вольны час

***Мэта:*** фарміраванне асноў здаровага ладу жыцця.

***Задачы:***

- удасканальваць функцыянальныя магчымасці сардэчна-сасудзістай, дыхальнай, нервовай сістэм дзяцей;
- фарміраваць веды аб карысці фізічных практыкаванняў, правілах здаровага харчавання;
- выхоўваць у дзяцей беражлівыя адносіны да свайго здароўя і здароўя навакольных, выклікаць цікавасць да культурных традыцый беларускага народа праз беларускія народныя гульні.

***Папярэдняя праца:*** гутарка пра свята ўраджаю багач, як вырошчваюць бульбу, пра шкодніка — каларадскага жука, развучванне беларускіх народных гульняў, рухомых гульняў.

**I. Арганізацыйны этап.**

***Вершы.***

**1-е дзіця.** Ой, вясёлае сёння свята!
І гасцей у нас багата!
Да нас на свята запрашаем
І сардэчна ўсіх вітаем!

**2-е дзіця.** Грэчка зжата.
Гола ў полі.
Жыта звезена даўно.
Толькі плаваюць паволі

Кучы хмар, як валакно.

**3-е дзіцяя.** Бульбінка-беларусачка,
Зялёная хустачка!
Добрая паненачка,
Шэрая сукеначка.

***Выхавацель.*** Добры дзень, удзельнікі свята! На календары восень — час, калі ўжо сабраны ўраджай на калгасных палетках і ўласных участках. Сёння да нас на свята прыйдзе госця. Хто ж яна? Вы даведаецеся, калі адгадаеце маю загадку:

Што ў родным нашым краі
Так паважаюць,
Што хлебам другім называюць? *(Бульба.)*

***Выхавацель.*** Так, гэта бульба! Яе вельмі любяць у нас на Беларусі. Ды і расце яна тут вельмі добра. Таму і называюць бульбу беларусачкай, а беларусаў — бульбашамі. Запрасілі мы яе на наша свята, але нешта яна спазняецца. Трошкі пачакаем і зробім ранішняю гімнастыку.

**II. Асноўны этап.**

***Выхавацель.*** Восень — гэта самая багатая пара, час завяршэння ўборкі ўраджаю, збору дароў прыроды: садавіны, гародніны, грыбоў, арэхаў, пара ўборкі бульбы. Пасля ўборкі ўраджаю людзі ладзілі свята ўраджаю — багач. Бралі посуд, напаўнялі яго жытам, устаўлялі ў зерне свечку. Такі багач пераносілі з хаты ў хату, тым самым жадаючы кожнаму гаспадару шчасця і багацця. Пакуль наша госця Бульбачка спазняецца, давайце мы з вамі пагуляем з яе суседкай па градцы — рэдзькай.

**Беларуская народная гульня «Рэдзька»**

***Мэта:*** развіваць хуткасць рэакцыі, смеласць, вынослівасць, каардынацыю, выхоўваць пачуццё сяброўства, узаемавыручкі.

***Матэрыял:*** маска-шапачка мядзведзя, гімнастычная палка, муляж рэдзькі.

З дзяцей выбіраюць «мядзведзя» і гульца, які водзіць, ён з муляжом рэдзькі ў руках садзіцца на падлогу. Астатнія дзеці — «рэдзька на градцы». Яны садзяцца адзін за адным пасля таго, хто водзіць, абхопліваюць абедзвюма рукамі таго, хто сядзіць спераду, і кажуць:

Мы на градцы сядзім і на сонейка глядзім!

Свяці, свяці, сонейка, каб нам было цёпленька.

«Мядзведзь» тупае.

***Дзеці.*** Хто там?

***Мядзведзь.*** Гэта я, мядзведзь!

***Дзеці.*** Чаго трэба?

***Мядзведзь.*** Рэдзькі!

***Дзеці.*** Дык вырві!

«Мядзведзь» падыходзіць да «градкі», бярэ гімнастычную палку, праносіць яе праз калону і «вырывае», абхапіўшы рукамі за пояс, «рэдзьку», якая сядзіць апошняй. Потым просіць: «Ідзі, мая рэдзька, на дапамогу!», яны пачынаюць разам цягнуць наступнага ўдзельніка гульні. Так працягваецца, пакуль на «градцы» нікога не застанецца.

***Выхавацель.*** Шмат працы трэба прыкласці, каб вырасціць бульбу. Хто бачыў і ведае, што трэба зрабіць, каб вырасціць бульбу?

***Дзеці.*** Спачатку трэба ўскапаць зямлю, затым пасадзіць бульбу, потым абагнаць градкі, паліваць, а ў восень выкапаць.

**Гульня «Збіраем ураджай»**

***Мэта:*** навучыць кідаць мяч у рухомую цэль.

***Матэрыял:*** мячыкі дыяметрам 8–9 см, па два на кожнага ўдзельніка, вялікая цацка грузавіка.

Удзельнікі дзвюх каманд стаяць шарэнгай адін насупраць друга. У кожнага ў руках па два мячыкі-«бульбінкі». Па сігналу ўдзельнікі кідаюць мячы ў рухомую

цэль — машыну. Гуляюць два разы. Колькі мячэй пападзе ў машыну, столькі гульцы сабралі «бульбы».

***Выхавацель.*** Вы, напэўна, ведаеце, што трэба рабіць, каб быць здаровым, моцным. А ці ведаеце вы, што ў бульбе ёсць вельмі палезны вітамін С? Яшчэ ў бульбе ёсць крухмал, з якога робяць кісель. Зараз я хачу праверыць, ці ведаеце вы, што карысна есці, а што шкодна. А таксама даведаемся, ці ведаеце вы словы беларускай мовы.

**Гульня «Карыснае — шкоднае»**

***Мэта:*** практыкаваць ва ўменні скакаць праз прадметы правым, левым бокам.

***Матэрыял:*** гумовае кальцо.

Дзеці стаяць па крузе ўнутры гумкі-кальца (высата 10–15 см ад падлогі). Калі вядучы называе карысны прадукт — дзеці стаяць на месцы, шкодны — выскокваюць з кальца. Той, хто не паспеў выскачыць, часова выбывае з гульні — з'еў шкодны прадукт.

***Прадукты:*** цыбуля, жвачка, малако, яблык, чыпсы, каша, сухарыкі, кола, груша, цукеркі, апельсін, тварог, бульба, сасіскі, рыба, марозіва, бульба фры, арэхі, капуста, піца, агурок, папкорн, гамбургер, сок, чупа-чупс, кабачок.

*Выходзіць Бульбачка.*

***Бульбачка.*** Добры дзень, мае харошыя! Якія вы ўсе прыгожыя! А я такая простая, нязграбная, зусім не прывабная!

***Выхавацель.*** Кінь, Бульбачка, журыцца!

Даражэнькія сябры,
Трэба тут дапамагчы.
Хай той запляскае ў ладкі,
Хто любіць з бульбачкі дранікі,
А за ім па парадку — бабку, клёцкі, пірагі!

***Выхавацель.*** Ці любіце вы бульбу?

***Выхавацель.*** Ну вось, Бульбачка, бачыш, як любяць цябе дзеці! Не журыся!

***Бульбачка.*** Дзякуй вам, дзеці! А я і не ведала, што вы мяне так любіце.

***Выхавацель.*** Пагуляй, лепш, Бульбачка, з намі!

## Гульня «Дранікі»

***Мэта***: практыкаваць ва ўменні кідаць мяч адзін аднаму, развіваць хуткасць і спрыт.

***Матэрыял:*** мяч сярэдняга дыяметра.

Дзеці становяцца ў шарэнгу, «гаспадыня» стаіць перад імі з мячом у руках. Яна кідае мяч тым, хто стаіць насупраць. Гульцы ловяць мяч і перакідваюць яго назад гаспадыне (змяшаюць цеста на дранікі). Па сігнале «Пячом дранікі!» гульцы разбягаюцца па «скаварадзе», а гаспадыня даганяе, як бы «пячэ дранікі», кідаючы ў іх мяч. Гульцы, якіх «спяклі», часова выбываюць з гульні. Па сігнале «Замешваем цеста!» гульцы зноў становяцца ў шарэнгу, перакідваюць мяч гаспадыне. Па сігнале гульня спыняецца, падлічваецца колькасць «спечаных дранікаў».

*Прыбягае каларадскі жук.*

***Жук.*** Гам, гам, гам! Вось ты дзе! Я цябе і тут знайшоў!

***Бульбачка.*** Адчапіся ты ад мяне. Летам не даваў спакою і зноў прыляцеў. І марозу на цябе няма! *(Плача.)*

***Выхавацель.*** Пачакай, Бульбачка, не плач. Скажы, што здарылася?

***Бульбачка*** *(плача).* Я раскажу вам, дзетачкі, што здарылася сёлета на школьным агародзе. Вясною дзеці пасадзілі мяне, бульбу. Я добра ўзышла. Яны мяне палолі, акучвалі, палівалі. Марылі, што восенню збяруць добры ўраджай. Але аднекуль прыляцеў каларадскі жук і пачаў есці мае лісточкі і дабраўся да кветак. І калі б дзеці не ўбачылі гэтага злодзея, то і не было б мяне на агародзе.

***Выхавацель.*** Дзеці! Вы напэўна здагадаліся, што гэта Каларадскі жук, які вельмі любіць бульбачку.

***Жук.*** Жу-жу-жу, жу-жу-жу.
Я на бульбачцы сяджу,
Не жу-жу, калі сяджу,
Усё на бульбачку гляджу.

А ў паветры закружуся,

То ўжо во як нажужуся.

***Выхавацель.*** Я думаю, што яго трэба прагнаць, а то і ў наступным годзе не будзе ад яго спакою.

**Гульня «Уцякай, бульбачка»**

***Мэта:*** замацаваць уменне перадаваць і катаць мяч адзін аднаму.

***Матэрыял:*** мяч сярэдняга дыяметра, маска-шапачка каларадскага жука.

Дзеці становяцца ў круг. Аднаму гульцу даюць мяч — «бульбачку», а другі гулец становіцца за кругам — гэта «каларадскі жук». Па сігнале дзеці перадаюць мяч-«бульбачку» па крузе. «Бульбачка» стараецца ўцячы, а «каларадскі жук» — дагнаць яе. «Бульбачку» трэба перадаваць акуратна, не кідаць, не выпускаць з рук.

***Жук.*** Не прагоніце! Вось з'ем вашу Бульбачку, тады сам ад вас пайду!

***Бульбачка.*** Ой, ой, ой! *(Плача.)* Што мне рабіць?

***Выхавацель.*** Дзеці  прагонім каларадскага жука.

**Гульня «Каларадскі жук»**

***Мэта:*** развіваць каардынацыю і ўзгодненасць рухаў.

***Матэрыял:*** маска-шапачка каларадскага жука, фітбол.

Дзеці становяцца ў два кругі: вялікі і маленькі, тварамі адзін да аднаго. Адзін з гульцоў — «каларадскі жук», які знаходзіцца паміж двума кругамі. Па сігнале дзеці кацяць па крузе фітбол, а «жук» павінен уцякчы ад яго. Калі фітбол дагнаў «жука», той выбірае новага «жука», а сам становіцца ў адзін з кругоў.

***Жук*** *(плача).* Не праганяйце мяне. Прабачце, калі ласка. Даруй, Бульбачка, я больш да цябе не дакрануся. У вас тут весела, а мне аднаму сумна.

***Выхавацель.*** Можа, даруем Жуку? Бульбачка, як ты скажаш?

***Бульбачка.*** Добра, на першы раз даруем.

***Выхавацель.*** Вось і добра. А цяпер будзем усе весяліцца. Пагуляй з дзецьмі, жук!

## Гульня «Бульба»

***Мэта:*** развіваць уменне валодаць сабой, выхоўваць вытрымку.

***Матэрыял:*** карзінка з мячыкамі малога дыяметра, маска-шапачка каларадскага жука.

Дзеці-«бульбачкі» знаходзяцца ў крузе дыяметр 6–7 м, «каларадскі жук» — той, хто водзіць — знаходзіцца па-за кругам, у руках у яго мячы дыяметрам 8–9 см. Дзеці-«бульбачкі» перамяшчаюцца ў крузе ў поўным прысядзе. «Жук» робіць прыскокі вакол гульцоў. Па сігнале «Жук» «бульбачкі» заміраюць, а «жук» становіцца спінай да круга-агарода і не варушацца. Затым жук кідае мячы праз галаву назад. Калі мяч трапляе ў бульбу прамым трапленнем або адскокам ад падлогі, то бульбачка часова выходзіць з гульні.

## III. Заключны этап.

***Выхавацель.*** Дарагая Бульбачка! Віншуем цябе са святам багач. Жадаем табе здароўя, будзь заўсёды такой прыгожай і смачнай.

***Бульбачка.*** Дзякуй, трэба мне ўжо ў дарогу, дзякуй, дзеці, за падмогу.

***Жук.*** Толькі нас не забывайце! Дружна жывіце!

***Бульбачка.*** Хутка расціце! Край свой любіце!

***Жук.*** Не таму любіце, што за ўсё цяплейшы ды прыгажэйшы.

***Бульбачка.*** А таму любіце, што за ўсё мілейшы і даражэйшы.

Бульбачка і жук выходзяць.

***Выхавацель.*** Вось і скончылася наша свята. Жадаю вам багата жыць, сваю мову і край любіць!

*Дзеці выходзяць з залы.*